Міжнародны дзень роднай мовы

# Пішам па-беларуску разам!

**У Міжнародны дзень роднай мовы педагогі, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, студэнты напісалі «Беларускую дыктоўку» ў чытальнай зале МДУ імя А.А.Куляшова.**

Да іх далучыліся таксама дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыня абласной арганізацыі ГА «Беларускі саюз журналістаў» Святлана Шутава, а таксама прарэктары МДУ імя А.А.Куляшова Уладзімір Ясеў і Алег Дзячэнка (член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь). Яны пісалі ўрывак тэксту з аўтабіяграфіі класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча «Дарога, якую прайшоў». Менавіта ён калісьці напісаў: «Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе. Хто забыў сваю мову – усё згубіў».

Правяла дыктоўку вядучая інфармацыйных праграм «Радыё Магілёў» Марына Касьянава. Яе голас добра знаёмы ўсім жыхарам нашай вобласці.

**Таццяна ПАДЛІПСКАЯ.**
*Фота аўтара.*



Удзельнікі «Беларускай дыктоўкі» паказалі добры вынік.